# *тэма:* *Арыгінальная літаратура XIV-XV стст.*

***1 Росквіт Вялікага Княства Літоўскага і развіццё літаратуры.***

**2 “Хаджэнне ў Царград і Іерусалім Ігнація Смаляніна”** ***як твор паломніцкай літаратуры пач. XV ст.***

***3 Творчасць Рыгора Цамблака.***

# *Росквіт ВКЛ і развіццё літаратуры*

Першараднае значэнне ў станаўленні *нацыянальнай літаратуры* мела:

**а) фарміраванне беларускай народнасці**, якое атрымлівае вызначальную ролю ва ўсіх сферах грамадска-палітычнага і культурнага быцця краю, пачынаючы з XIII ст., і ў асноўным завяршаецца ў XV – XVI стст.

**б) ўтварэнне** на тэрыторыі будучых Беларусі, Літвы і Украіны **новай феадальнай дзяржавы.**

**в) фарміраванне старабеларускай мовы.** Паспяховае развіццё беларускай мовы было звязана з наданнем ёй статуса *дзяржаўнай* у ВКЛ. Мова стала абслугоўваць усе сферы свецкага грамадскага і культурнага жыцця ў краіне.

# *Росквіт ВКЛ і развіццё літаратуры*

**утварэнне** *на тэрыторыі будучых Беларусі, Літвы і Украіны* **новай феадальнай дзяржавы:**

- **Яшчэ ў другой палове XII ст. у Прынёманскім краі ўзнікла васальнае Літоўскае княства.**
- **Ужо пры *Міндоўгу* (каля 1248–1263) дзяржава атрымала назву Вялікае княства Літоўскае, са сталіцай у Наваградку. Тэрыторыя ВКЛ была заселена змешаным або часткова «аславяненым» літоўскім насельніцтвам, *ліцьвінамі* (змяшанне нашчадкаў *крывічоў, дрыгавічоў, аўкштайтаў, яцвягаў* і прадстаўнікоў іншых этнасаў).**
- **Распачатая *Міндоўгам* палітыка па ўтварэнні і ўмацаванні новай дзяржавы (*дзеля чаго ён выкарыстоўваў розныя сродкі, у тым ліку хрышчэнне і каранаванне*) была прадоўжана *Войшалкам* (1254–1268) і *Трайдзенем* (1270–1282). Вельмі паспяховымі былі дзеянні *Віценя* (каля 1295–1316), пры якім да ВКЛ было канчаткова далучана Полацкае княства (1307).**

# *Росквіт ВКЛ і развіццё літаратуры*

- **Аб'яднанне беларускіх земляў працягвалася пры *Гедзіміне* (1316–1341). У склад дзяржавы былі ўключаны *Віцебшчына, Берасцейшчына, Меншчына, Тураўшчына* і *Піншчына*, *частка* *Вальні і Падляшша*.**
- **У адрозненне ад земляў гістарычнага ядра ВКЛ, якія здаўна называліся «Літвою», гэтыя тэрыторыі захавалі агульнае найменне «Русь», таму дзяржава пачала называцца *Вялікім княствам Літоўскім і Рускім*, а сам Гедзімін тытулаваўся *вялікім князем Літвы і Русі*.**
- **Пры ім сталіцай ВКЛ стала *Вільня.***

# *Росквіт ВКЛ і развіццё літаратуры*

- Наступнікі Гедзіміна ***Альгерд*** (каля 1296–1377; з 1345 – вялікі князь) і ***Кейстут*** падзялілі тэрыторыю Княства.
- **Разам з асноўнай часткай славянскіх земляў <u>Альгерду</u> дасталася і *вярхоўная ўлада*, што сведчыць аб вядучай ролі ўсходнеславянскага этнічнага элемента ў жыцці ВКЛ.**
- **<u>Альгерд</u> вёў палітыку, накіраваную на культурна-этнічнае аб'яднанне беларускіх земляў:**
- **1) наладзіў плённыя сувязі з праваслаўным духавенствам,**
- **2) ахрысціў сваіх дзяцей,**
- **3) надаў *старабеларускай мове* статус *<u>дзяржаўнай</u>*.**

# *Росквіт ВКЛ і развіццё літаратуры*

- **Цэнтралізатарскую палітыку на ўсходне-славянскіх землях працягваў яго пляменнік *Вітаўт* (1350-1430, княжыў з 1392).**
- **ВКЛ пры Вітаўце дасягнула апагея сваёй магутнасці і ўплывовасці.**

***ВІТАЎТ:***

**1) дамогся стварэння і прызнання незалежнай ад Масквы праваслаўнай Літоўска-Наваградскай мітраполіі;**

**2) умешваўся ў справы Залатой Арды і Крыма;**

**3) у цэлым паспяхова праводзіў наступальную палітыку супраць Тэўтонскага і Лівонскага ордэнаў.**

Літаратурны працэс 2-ой паловы XIII – XV ст. адбываўся ў межах жанраў, выпрацаваных раней.

- У познім Сярэднявеччы бытавала ***перакладная*** і ствараліся ***арыгінальная*** літаратура.

---

- Арыгінальная літаратура Беларусі XIV–XV стст. адносна небагатая (*калі не прымаць пад увагу шматлікія помнікі* ***дзелавога*** *пісьменства, якія не належаць да ўласна мастацкай літаратуры*) і прадстаўлена лічанымі *арыгінальнымі* творамі *традыцыйных* жанраў.
- На працягу XIV–XV ст. зусім не развіваўся такі жанр царкоўна-рэлігійнай літаратуры як **жыціе**. Адзіны твор агіяграфічнага жанру гэтага перыяду, тэматычна і геаграфічна звязаны з літоўска-беларускімі землямі, – ***"Жыццё літоўскіх (віленскіх) пакутнікаў"*** – быў вядомы на Русі прыкл. з сяр.XV ст. у паўднёваславянскай рэдакцыі.
- У XIV–XV ст. слаба развіваецца на Беларусі і **ўрачыстае царкоўнае красамоўства**. *Беларускае духавенства не дало тады ні аднаго прамоўцы, якога можна было б хоць прыблізна параўнаць з Кірылам Тураўскім*. Адзіная прыкметная асоба таго часу ***Рыгор Цамблак.***
- З *арыгінальных* твораў іншых жанраў царкоўна-рэлігійнага пісьменства XIV–XV ст. значнае месца ў гісторыі беларускай літаратуры займае ***«Хаджэнне ў Царград і Ерусалім» Ігната Смаляніна***.

# “Хаджэнне ў Царград і Ерусалім Ігнація Смаляніна”

- Смаленскі дзяк Ігнат у 1389 г. суправаджаў рускага мітрапаліта Пімена ў час яго паездкі ў ***Царград*** (цяпер Стамбул).
- Застаўшыся за мяжой, ён спачатку жыў у сталіцы Візантыйскай імперыі, пасля ў ***Ерусаліме***, адкуль у 1396 г. пераехаў на ***Афон***, а потым вярнуўся ў ***Маскву*** (каля 1405 г.)
- Апісанню гэтага шматгадовага падарожжа і прысвечана яго «**Хаджэнне...**».

# “Хаджэнне ў Царград...”

- Ігнат дакладна апісаў увесь шлях на Блізкі Усход, усе мясціны, дзе яму давялося пабываць.
- Пісьменнік падрабязна апавядае пра поўнае небяспекі і розных прыгод падарожжа з Масквы ў Царград па сушы, а пасля па Доне, Азоўскім і Чорным морах.
- Апісваючы Царград, ён звяртае ўвагу на яго шматлікія храмы і манастыры, а таксама расказвае пра значныя падзеі *грамадска-палітычнага* жыцця Візантыі, пра барацьбу за ўладу розных прэтэндэнтаў на царскі трон.
- Асабліва ярка і маляўніча пададзена ў «Хаджэнні...» каранацыя візантыйскага імператара Мануіла ІІ у велічным Сафійскім храме, *поўная знешняга бляску і параднасці.*

# “Хаджэнне ў Царград...”

- «Хаджэнне...” Ігната Смаляніна – напісаны на старажытнарускай мове ў <u>форме летапісу, які месцамі пераходзіць у дзённік</u>.
- Твор вылучаецца вялікай фактычнай дакладнасцю, мае важнае навукова-пазнавальнае значэнне як каштоўная крыніца па грамадзянскай гісторыі, геаграфіі, мастацтве, гісторыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Русі, Візантыі і Блізкага Усходу.
- Твор уяўляе сабою своеасаблівы *пераходны этап* <u>ад уласна хаджэнняў</u> у святую зямлю <u>да апісання падарожжаў</u> за мяжу наогул.

# *Творчасць Рыгора Цамблака*

- ***Рыгор Цамблак*** (1364–1419) родам з Балгарыі.
- **У 1415 г. па ініцыятыве князя Вітаўта на саборы праваслаўных епіскапаў ВКЛ у Навагрудку быў абраны *кіеўскім мітрапалітам*, таму значная частка жыццёвага і творчага шляху гэтага таленавітага пісьменніка была звязана з Беларуссю і Украінай.**

- **Цамблак – *аўтар* 1) шматлікіх <u>пропаведзей</u> на розныя рэлігійныя святы, 2) пахвальных <u>«слоў»</u> асобным хрысціянскім святым, 3) шэрага <u>жыцій</u>, складзеных на царкоўнаславянскай мове.**
- **Яго паэтычныя, прасякнутыя ўзнёслым лірызмам *«словы» багатыя на вобразна-выяўленчыя сродкі* і шмат у чым блізкія па сваіх ідэйна-мастацкіх асаблівасцях да твораў класіка раннехрысціянскай літаратуры Іаана Златавуста, хоць месцамі больш напышлівыя і дыдактычныя.**

# *Творчасць Рыгора Цамблака*

- Напісанае ў Беларусі *жыціе* яго настаўніка, балгарскага патрыярха Яўхіма Тырнаўскага – адзін з найлепшых твораў гэтага жанру ў славянскіх літаратурах XV ст.
- Творы Цамблака шырока распаўсюджваліся на землях усходніх славян у розных зборніках, карысталіся значнай папулярнасцю.
- Яго творчая дзейнасць на Русі – яркі прыклад плённасці міжславянскіх культурных узаемасувязей.

# *Творчасць Рыгора Цамблака*

“*Слова на адсячэнне галавы Іаана Хрысціцеля*”:

- **Градацыя думкі пісьменніка яскрава прасочваецца ў арганічным пераходзе ад біблейскага сюжэта да асабістых перажыванняў і пачуццяў.**
- **Прапаведнік крытыкуе валадароў, якія жорстка абыходзяцца са сваімі падначаленымі.**
- **З пазіцый хрысціянскай маралі пісьменнік імкнецца раскрыць псіхалогію забойцы.**
- **У шматлікіх абвінаваўчых сентэнцыях аўтар выказвае адносіны да адлюстроўваемых падзей, абгрунтоўвае ўласную пазіцыю.**

# Творчасць Рыгора Цамблака

“***Слова пахвальнае Яўфімію (Тырнаўскаму)***” (*акад.выд. С.226-227*):

- **у гэтым слове знаходзіць вырашэнне асэнсаванне гістарычнасці быцця і праблема зямнога прызначэння чалавека.**
- **На фоне трагічных для Балгарыі падзей – *яе заняволення асманскімі заваёўнікамі, прымусовага насаджэння ісламу, знішчэнне вышэйшага і адукаванага саслоўя* – Цамблак услаўляе мужнага абаронцу, палымянага патрыёта, таленавітага пісьменніка, пастыра па “*апостальскіх і айчынных правілах*” Яўфімія.**
- **Тырнаўскі патрыярх гнеўна асуджае вераломства і бесчалавечнасць турэцкага *хана Баязета*, які люта расправіўся з мірнымі жыхарамі горада. Цамблак падрабязна апісвае злачынствы турэцкага хана ў праваслаўным храме Тырнава.**

# Творчасць Рыгора Цамблака

- Паказваючы трагічныя карціны народнага бедства, аўтар заклікае змагацца з захопнікамі, якія прынеслі столькі гора і пакут усім славянскім народам. Увесь твор прасякнуты думкай аб Радзіме. З замілаваннем апісвае аўтар ваколіцы Тырнава, іх прыгажосць.
- У аснове мастацкага бачання Цамблака – новыя адносіны да чалавека, усведамленне каштоўнасці яго ўнутранага свету, яго індывідуальных перажыванняў (духоўны стан Яўхімія, калі яму пагражаюць смяротным пакараннем). Вызначальным момантам у характарыстыцы Яўфімія з'яўляюцца яго адносіны да паствы, народа. Аўтар падкрэслівае іх духоўнае адзінства у час нацыянальнай трагедыі.
- Вобраз Яўфімія надзелены рысамі народнага героя, змагара.